ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 69 | ПЯТНІЦА, 24 САКАВІКА 1933 г. | № 69

НА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЬЕЗЬДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

У падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ўступіць на шлях сацспаборніцтва.

А 10 гадзіне раніцы 22 сакавіка другое паседжаньне ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў адкрывае старшыня ЦВК т. Чарвякоў. Слова для дакладу аб першай бальшавіцкай сяўбе другой пяцігодкі і задачах калгасьнікаў прадастаўляецца сэкратару ЦК КП(б)Б т. Шаранговічу, чатырохгадзінны даклад якога неаднаразова прыпыняецца гучнымі працяглымі апладысмэнтамі. Дэлегаты горача сустракаюць словы т. Шаранговіча аб уступленьні БССР у спаборніцтва з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне сяўбы.

Пад бурныя апладысмэнты дэлегатаў запрашаецца ў прэзыдыум рабочы-ударнік з 40-гадовым вытворчым стажам, чырвонасьцяжнік Федасееў, які ўначальвае дэлегацыю на ўсебеларускі зьезд ад 22-тысячнага калектыву Іжорскага заводу блюмінгаў у Ленінградзе. Гэты завод узяў шэфства над яўрэйскімі нацыянальнымі калгасамі Савецкай Беларусі, уступіў у дагаворныя ўзаемаадносіны з калгасамі БССР.

Вітаючы ўдзельнікаў зьезду, т. Федасееў адзначае, што дэлегацыі даручана асабліва падкрэсьліць інтэрнацыянальную сувязь, якая існуе паміж Іжорскім мэталюргічным гігантам і нацыянальнымі яўрэйскімі калгасамі БССР.—Мэта нашага прыезду,— кажа т. Федасееў, ня толькі вітаць ваш зьезд. Мы хочам таксама абмяняцца вопытам работы, праверыць шляхам выезду ў паасобныя калгасы, што імі зроблена ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Далей т. Федасееў дзеліцца вопытам ударніцтва на Іжорскім заводзе, заклікае дэлегатаў у падрыхтоўцы да правядзеньня сяўбы ўступіць на шлях сапраўднага сацспаборніцтва.

✻ На імя прэзыдыуму зьезду атрымана з Севастопалю прывітальная тэлеграма ад асабістага складу падшэфнага БССР лінкора „Парыская камуна“.

✻ Пасьля рапартоў дэлегацыі менскага чырвонасьцяжнага скурзаводу «Бальшавік», дэлегацыі вайскова-паветранага флёту, кароткага падагульваючага слова т. Чарвякова другое паседжаньне зьезду закрываецца.

(БелТА).

Першага красавіка—генэральная праверка гатоўнасьці савгасаў, калгасаў, МТС і вёсак аднаасобнікаў нашага раёну да веснавой сяўбы.

„ПРАВЕРЦЕ, ЯК У ВАС З НАСЕНФОНДАМІ, ПРАВЕРЦЕ ІНВЭНТАР, РЫХТУЙЦЕ КАНЯ. ПЕРАДАВЫЯ, АРГАНІЗУЙЦЕ ДАПАМОГУ АДСТАЮЧЫМ!“.

(З ліста дэлегацыі Віцебшчыны на усебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў да усіх калгасьнікаў Віцебскага раёну).

АБ УДЗЕЛЕ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКІМ ПРОБНЫМ ВЫЕЗЬДЗЕ Ў ПОЛЕ.

Пастанова пасеукому пры гаркоме КП(б)Б ад 20 сакавіка.

Арганізаваць удзел у правядзеньні ўсебеларускага пробнага выезду калгасаў, савгасаў, МТС і вёсак у поле з 25 сакавіка 1933 г. Усераённы пробны выезд у поле правесьці 1 красавіка. Для арганізацыі выезду правесьці наступнае:

1. Арганізаваць па ўсіх савгасах, калгасах, МТС і вёсках спэцыяльныя камісіі, якія павінны як да выезду, так і ў час пробнага выезду праверыць гатоўнасьць да сяўбы кожнага савгасу, калгасу, МТС і вёскі. Пасьля пробнага выезду правесьці сходы па падвядзеньні вынікаў пробнага выезду, ускрыўшы ўсе прарывы і недахопы ў падрыхтоўцы да сяўбы, накіраваўшы далейшую работу па выпраўленьне ўскрытых недахопаў.

2. Усім сельсаветам, сельпарт'ячэйкам, брыгадзірам і ўпаўнаважаным ГК КП(б)Б заразжа пачаць падрыхтоўку да пробнага выезду, шляхам растлумачэньня сутнасьці і задач пробнага выезду, мабілізуючы кожнага калгасьніка, рабочага савгасу, працоўнага аднаасобніка на сканчэньне падрыхтоўчай работы да веснавой пасеўкампаніі, на барацьбу за поўную гатоўнасьць савгасаў, калгасаў, МТС і вёсак да сяўбы, забясьпечыўшы ўдзел іх ва ўсераённым пробным выезьдзе ў поле.

3. Прапанаваць ГК КСМ мабілізаваць увагу ўсёй камсамольскай арганізацыі на выкананьне задач, пастаўленых пленумам ЦК ЛКСМБ па арганізацыі ўсебеларускага пробнага выезду ў поле савгасаў, калгасаў, МТС і аднаасобнікаў, для чаго камандыраваць па лініі шэфскіх арганізацый брыгадзіраў з ліку актыву ў кожны сельсавет. Абавязаць ГК КСМ арганізаваць масавую праверку выкананьня пастаноў ураду аб захаваньні і падрыхтоўцы цягавай сілы да сяўбы. У горадзе—сіламі камсамольцаў і піянэраў, за час ударнага пяцідзёньніка, скончыць выкананьне кантрольных лічбаў па зборы попелу. У адстаючых па рамонце сельгасінвэтару калгасах арганізаваць па лініі шэфствуючых калектываў КСМ дапамогу ў сканчэньні рамонту і праверцы якасьці рамонту сельгасінвэтару.

4. Прапанаваць гарадзкім парткалектывам, ячэйкам, фабзавкомам і дырэктарам прадпрыемстваў арганізаваць пробны выезд у калгасы і практычна дапамагчы падшэфным сельсаветам і калгасам падрыхтавацца да пробнага выезду.

5. ГК КП(б)Б напярэдадні савецкія, камсамольскія і земельныя арганізацыі ад парадной шуміхі і мітынгоўшчыны. Падрыхтоўку і арганізацыю самога пробнага выезду падпарадкаваць дзелавой рабоце па падрыхтоўцы да сяўбы кожнага савгасу, калгасу, МТС і вытворчай брыгады.

6. Абавязаць газэту «Віцебскі пралетары» шырока папулярызаваць задачы пробнага выезду ў поле, ход падрыхтоўкі да выезду ў калгасах, савгасах, МТС і вёсках і вынікі пробнага выезду.

7. Абавязаць упаўнаважаных гаркому даслаць да 3 красавіка вынікі правядзеньня пробнага выезду па сельсаветах у ГК КП(б)Б.

Захаваньне насенных фондаў —у цэнтр увагі.

У бліжэйшыя дні закончыць абмен насеньня.

КАЛГАСУ „СІЛАЧ“ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА СУСЕДНІХ КАЛГАСАЎ.

ДОЎЖА. 22. (Па тэлефоне ад нашага карэспандэнта).

Калгас «Новы шлях» (Даўжанскі сельсавет) насенныя фонды яшчэ не засыпаў, авёс на лішкі жыта яшчэ не абменены. Плян вывазкі гною выкананы, але-ж з двароў калгасьнікаў гной не вывазіўся. Цягавая сіла ў дрэнным стане.

У калгасе «Шлях Ільліча» лішкі насеньня яшчэ не абменены на нехапаючыя культуры. З калгасных двароў гной не вывазіўся.

У калгасе «Інтэрнацыянал» не заменена 700 пудоў жыта на авёс, акрамя гэтага не хапае 14 цэнтн. зернавых культур па страхавым фондзе. Гною з патрэбных па пляне 3600 вазоў, вывезена 3000. Яшчэ не адраманцаваны 20 цялег. У брыгадзе Калінчанка пры праверцы насеннай бульбы выяўлена, што ў адным з акопаў было каля 1600 кілёграм замёрзшай бульбы. Па 4-й і 5-й брыгадах зусім няма брыгадзіраў—старыя зьняты з работы, а новыя ня прымаюць брыгад. Брыгадзірам гародняй брыгады вызначан калгасьнік, ня ведаючы гэтай справы.

На калгасе «Сілач» насенныя фонды засыпаны толькі на 40 процантаў; не хапае да 200 цэнтнераў насеньня бульбы, аўсу, вікі. Рамонт цялег ня скончаны.

Салаўёва.

23 сакавіка на ўсебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

МЕНСК, 23 сакавіка. (Па тэлефоне ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

На раніцнім паседжаньні зьезду 23 сакавіка працягваліся спрэчкі па дакладзе т. Шаранговіча. З вялікімі прамовамі выступілі Паркамзем тав. Рачыцкі і сэкратар ЦК ЛКСМБ тав. Герповіч.

✻ На зьезд прыбыла дэлегацыя са зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці.

✻ На вечэрнім паседжаньні з вялікай прамовай выступіў старшыня ЦКК КП(б)Б Парком РСІ тав. Лычоў.

✻ Увечары на прадпрыемствах Менску адбыліся вечары-сустрэчы дэлегатаў зьезду з рабочымі. Віцебская дэлегацыя была на вечары сустрэчы з рабочымі-ўдарнікамі машынабудаўнічага заводу імя Варашылава.

МЕНСК, 23 САКАВІКА, ПА ТЭЛЕФОНЕ АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА.

ЛІСТ З УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ВІЦЕБСКАГА РАЁНУ.

Вам пішам мы, вашы пасланцы па ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Наш бальшавіцкі зьезд пачаўся 21 сакавіка. Слухалі мы вялікі даклад сэкрэтара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча аб тым, як лепш правесьці веснавую сяўбу. Наш зьезд віталі рабочыя фабрык і заводаў Беларусі, да нас прыехала дэлегацыя ўральскіх рабочых і калгасьнікаў Заходняй вобласьці. Нас віталі прадстаўнікі нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Зараз ідуць спрэчкі па дакладзе тав. Шаранговіча. Талкова выступаюць дэлегат за дэлегатам з розных куткоў Савецкай Беларусі. Сёньня выступіў і наш дэлегат—тав. Садавы з калгасу імя Сталіна, Машканскага сельсавету.

З вялікім энтузыязмам праходзіць уся работа зьезду. Учора наш зьезд прыняў дагавор на сацспаборніцтва з Заходняй вобласьцю. Наша віцебская дэлегацыя, па вашым даручэньні, заключае сацдагавор з Менскім і Гомельскім раёнамі на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Вялікія абавязкі ўскладаюцца па нас у гэтую вясну. Мы гэта ўцямілі. Многа аб чым раскажам, калі прыедзем са зьезду.

Мы заклікаем вас, усіх калгасьнікаў, падцягнуць адстаючыя вучасткі. Праверце, як у вас з насенфондамі, праверце інвэнтар, рыхтуйце каня. Перадавыя, арганізуйце дапамогу адстаючым. Вясна на насу!

Мы заклікаем усе калгасы і калгасьнікаў Віцебшчыны арганізаваць у гонар усебеларускага зьезду чырвоныя абозы па продажы хлеба дзяржаве.

Хай жыве ўсебеларускі ўдарны калгасны зьезд!

Хай жыве першы ўдарнік тав. Сталін!

Дэлегацыя ад Віцебшчыны на Ўсебеларускі зьезд ударнікаў калгасаў:

МАКСІМАВА (калгас „Труженік“, Старасельскага сельсавету), БУЕВІЧ (калгас „Інтэрнацыянал“, Даўжанскага сельсавету), БУДКЕВІЧ (калгас „Шлях Леніна“, Міхалёўскага сельсавету), ШЫЛАВА (калгас „Замасточча“, Замастоцкага сельсавету). РАМАНАВА (калгас „Прагрэс“, Бабініцкага сельсавету), ІВАНОЎ (калгас „Прызыў“, Бараўлянскага сельсавету), ДЖАН ВАЙ ФУ (калгас „Маркавічы“, Мікалаёўскага сельсавету), ФРЭЙДЗОН (калгас „Наер лэбн“, Віцебскага сельсавету), САДАВЫ (калгас імя Сталіна, Машканскага сельсавету), ЯСЬКІН (калгас імя „Парыскай камуны“, Шумнянскага сельсавету), ЛЫСЕНКА (калгас імя Чырвонай арміі, Ялагінскага сельсавету), Работніцы фабрыкі „Дзьвіна“ НІКАЛАЕВА і ХОБЕЦ, СТРОНГІН (гарком КП(б)Б), ФАЛКІН („Віцебскі пралетары“).

МЕНСК, 23 сакавіка. (Па тэлеграфе).

Сёньня на зьезьдзе ў спрэчках па дакладзе т. Шаранговіча выступіў на ўкраінскай мове дэлегат Віцебшчыны тав. САДАВЫ (калгас імя Сталіна, Машканскага сельсавету).

Прамова тав. Садавога.

— У сваім дакладзе т. Шаранговіч так правільна, яскрава гаварыў, нібы ён сам быў у нашым калгасе; усё бачыў.

Таварышы, давайце пагаворым, хто нам перашкаджае ў калгасе. Вопыт сяўбы мінулага году паказаў, што кулакі, былыя паны, жандары, якія распаўзьліся па БССР, праводзілі сваю шкодную агітацыю. Гэта гаворыць аб тым, што мы недастаткова пільна сачылі за манаўрамі клясавага ворага. Мы павінны, прыехаўшы на месцы, хутчэй пазбавіцца ад кулакоў, падкулачнікаў, выгнаць іх з калгасаў. Напрыклад, у калгасе, дзе я зьяўляюся старшынёй, у адным пункце было 12 сьвіней. Мы выгадавалі іх, прадалі Чырвонай арміі. Калі іх зарэзалі, то аказалася, што ўнутры кожнай сьвіньні было 5—6 цьвікоў. Справа ў тым, што недалёку ад сьвінарніка жыў кулак, які праводзіў шкодніцкую работу, кідаў цьвікі ў карыта, з якога кормяць сьвіней.

Як нашы беднякі і сераднякі жылі да калгасаў, як яны жывуць сёньня? У маім калгасе ёсьць калгасьнік Пучко Іван. Да ўступленьня ў калгас ён меў адну карову і каля трох дзесяцін зямлі. У гэтым годзе Пучко і яго жонка выпрацавалі 540 працадзён. Мае двух малых дзяцей. Дык вось за год Пучко заробіў звыш 30 пудоў хлеба, 12 пудоў яравых, 72 пуды бульбы і іншыя прадукты.—Мае да ўступленьня ў калгас,—кажа ён,—хлеба хапала на 2 месяцы, а зараз я да новага ўраджаю забясьпечан, ды яшчэ магу хлеба прадаць дзяржаве.

Цяпер пра каня. У гаспадарцы конь усёроўна, што для чалавека паветра. Ня буду скрываць—недахопы ў маім калгасе ёсьць, мы іх зьнішчаем і зьнішчым. Але конь у маім калгасе падрыхтаваны да першай веснавой сяўбы другой пяцігодкі на ўсе 100 пропантаў.

Раней было так: калі я альбо брыгадзіры даюць загад, то калгасьнік хоча—выканае, хоча—ня выканае. З гэтае прычыны было шмат прагулаў, нават у самую гарачую пару. Зараз, выконваючы паказаньні нашых кіруючых органаў, мы падцягнулі працдысцыпліну. Мы кажам лодырам і прагульшчыкам: сярод нас няма месца лодыру—зрыўшчыку калгаснае працы. Мы выкінулі з калгасу лодыра Шалуху, які за 2 гады меў усяго 50 працадзён. Узмацненьня працдысцыпліны ў калгасе я дабіўся такім чынам: сваім брыгадзірам і калгасьнікам я ня проста загадваю і не камандую. Я звычайна прыходжу, раюся з імі. Гэта ўздымае іх сьвядомасьць, пачуцьцё адказнасьці, як гаспадароў у калгасе. За сваю пяцігадовую працу ў калгасе я ўпэўніўся, што гэты мэтад сами лепшы.

Далей я хачу сказаць як дапамагаюць нам нашы культурныя сілы. У Віцебскім раёне ёсьць аграномы, землямеры, але іх у нашым калгасе ня відаць. Калі да нас раз прыехаў землямер, то першым яго пытаньнем было: колькі каштуе ў вас малако. Мы павінны ўсю культурную сілу накіраваць у масы, каб яны разам з намі праводзілі работу, дапамагалі нам. Я сам не магу скласьці дэталёва вытворчы плян, агранома-жа скончыў вышэйшую навучальную ўстанову і таму мне патрэбна моцная таварыская дапамога агранома, а яе часта ў нас няма.

Па даручэньні дэлегатаў Віцебскага раёну выклікаю на сацыялістычнае спаборніцтва калгасьнікаў Менскага і Гомельскага раёнаў. Спаборніцтва паміж намі—вялікая дапамога, вялікая справа. Пад сьцягам сацспаборніцтва, пад кіраўніцтвам нашае ленінскае партыі мы заваюем перамогу ў першай сяўбе другой пяцігодкі. Нам трэба даручыць прэзыдыуму, каб ён распрацаваў умовы сацспаборніцтва і мы, прыехаўшы з гэтай сацумовай у Віцебск, прыкладзем усе сілы, каб выйграць «галоўны бой, бой арміі калгасьнікаў за пасьпяховае правядзеньне першай сяўбы другой пяцігодкі».

Хай жыве нашае калгаснае будаўніцтва!

Хай жыве наш правадыр т. Сталін!

Сваечасова вывезем угнаеньне—атрымаем высокі ўраджай.

СТАРАЕ СЯЛО. (Па тэлефоне ад нашага спэцкора).

Нягледзячы на тое, што Старасельскі сельсавет занесены кандыдатам на чорную дошку за марудныя тэмпы ў рабоце па вывазцы гною, калгасы сельсавету па-ранейшаму ганебна адстаюць.

Калгас «Новае жыцьцё»—павінен вывезьці 2000 вазоў, вывез толькі 600.

Калгас «Камунар» ня вывез яшчэ 300 вазоў і ня дзіўна, бо калгасьнікі накладаюць на адзін воз толькі па 2—2,5 цэнтнэры гною.

Калгас «Труженік»—выканаў 50 процантаў пляну.

Калгас імя 1-га мая—з 2100 вазоў вывез толькі 860.

Грынман.

Канкрэтнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы адсутнічае.

Пробны выезд у поле паказаў, што рад калгасаў Шумнянскага сельсавету дрэнна падрыхтаваўся да веснавой сяўбы.

У камуне «Іскра ленінская» жывая цягавая сіла абязьлічана, не прымацавана да калгасьнікаў, масца шмат коняй хворых, са зьбітымі плячыма. Інвэнтар паспраўны. Насеньнем камуна не забясьпечана.

Некалькі лепшае становішча ў калгасе „Пяцігодка—за 4 гады“. Усе калгасьнікі зьявіліся на выезд у вызначаны час. Коні з інвэнтаром прымацаваны да калгасьнікаў. Калгас поўнасьцю забясьпечан насеньнем, мае нават лішкі. Але трэба адзначыць, як недахоп, што рамонт складанага інвэнтару (жняркі, бульбакапалкі і інш.) ня скончан. Чатыры плугі з-за дрэннай якасьці рамонту былі забракаваны, не хапае 7 аралейных хамутоў.

Паміж калгасамі і брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшую падрыхтоўку да сяўбы. Калгас «Пяцігодка—за 4 гады» выклікаў на сацспаборніцтва калгасы імя Будзёнага і «Камінтэрн» на сканчэньне веснавой сяўбы да 25 мая і абавязаўся дабіцца наступнай ураджайнасьці: аўсу—10 цэнтн. з га, ячменю 11 цэнтнэраў і бульбы —120 цэнтн.

Брыгады №№ 3 і 4 калгасу «Камінтэрн» сваечасова зьявіліся на паказанае месца. Брыгады №№ 1 і 2 зьявіліся несваечасова і непадрыхтаванымі—коні ў гэтых брыгадах худыя і замораныя, не хапае збруі.

Адсутнасьць працдысцыпліны ў паасобных калгасах асабліва выявілася на пробным выезьдзе. У калгасе «Камінтэрн», напрыклад, з 69 працаздольных жанчын зьявілася на выезд толькі 30.

Пробны высад паказаў, што з боку сельсавету і сельпарт'ячэйкі канкрэтнае і аперацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўкай да сяўбы адсутнічае.

С—ка.

Аграном Угорэц гноем ня хоча займацца.

Зімовая возка гною мае вялікае значэньне таму, што яна ў час веснавой сяўбы вызваляе рабочыя рукі. Але рад калгасаў ня ўцямілі таго, што вывазіць гной зімой трэба так, каб ён ня страціў сваіх спажыўных якасьцей, складаць у вялікія кучы і абавязкова ўтрамбоўваць. У калгасах В.-Лётчанскага сельсавету: «Віцебскі пралетары», «Культурны фронт», „Пабеда“ да вывазкі гною адносяцца абы-як—развозяць па ўсім полі маленькімі кучкамі, без утрамбоўкі, без падсьцілкі і г. д. У гэтых калгасах упусьцілі з віду, што шмат карысных матэрый гною прападае.

Здавалася б, што кіраўніцтва гэтай работай —абавязак і вучасткова агранома Угорэца, які ня мог ня прыкмеціць, што парушаюцца элемэнтарныя правілы возкі гною. Але агранома гэта ня турбуе —ён ўніводнаму брыгадзіру нават не ўказаў, як правільна вывозіць і складаць гной.

Рыг. Васільлеў.

Вінаватых трэба сурова пакараць.

Пробны выезд у поле калгасаў Руніцкага сельсавету паказаў непадрыхтаванасьць цягавай сілы да веснавой сяўбы.

У калгасе імя Сталіна з 42-х коняй віводзін ня ўпітаны і знаходзяцца ў дрэнным стане. Большасьць коняй паражаны вашыма, некаторыя хвораюць часоткай. Гэта тлумачыцца тым, што да коняй адносяцца па-барбарску. У паловы коняй з-за недагляду абламаліся і звужаны капыты. Праўленьне калгасу на чале з старшынёй Воўкавым ня прымае ніякіх захадаў, каб палепшыць догляд коняй.

У калгасе імя Мархлеўскага конскае пагалоўе таксама паражано вашыма і часоткай. Конюх Шашкоў Мікалай (ён-жа член праўленьня) наўмысьля ня чысьціць коняй, не дае сваечасова корму, за ўвесь год не вывазіўся гной са стайні. Старшыню калгасу Занковіча справа барацьбы за здаровага каня зусім ня цікавіць.

У брыгадзе Прудкова калгасу імя Дзяржынскага конюхі Катовіч Мацьвей і Катовіч Фэлікс не жадаюць работаць і шкодніцкі адносяцца да каня.

Вінаватых у псаваньні конскага пагалоўя трэба пакараць з усёй суровасьцю рэвалюцыйнай законнасьці.

Брыгада «В. П.»: Бас, Самалазаў.

Арганізавалі міжкалгасную насенную пазыку.

Калгасы Шумнянскага сельсавету наладзілі абмен і перадачу лішкаў насеньня тым калгасам, якія адчуваюць у ім патрэбу.

КАЛГАС «КАМІНТЭРН».

Поўнасьцю забясьпечан насеньнем і перадае свае лішкі: калгасу «Зорка»—8 цэнтн. вікі, імя Будзёнага—95 кілё ільнонасеньня.

КАЛГАС „ПЯЦІГОДКА—ЗА 4 ГАДЫ“.

Насеньнем забясьпечаны, маючыяся лішкі ільнонасеньня ў колькасьці 64 кілё перадае калгасу «Новы сьвет», камуне «Іскра ленінская» 3 цэнтн. гароху.

КАЛГАС ІМЯ ПАРКАМУНЫ.

11,3 цэнтн. гароху перадае калгасу імя Будзёнага і 14 цэнтн.—калгасу «Новы сьвет».

КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА.

Перадае 18 цэнтн. вікі калгасу імя Будзёнага і 12 цэнтн. вікі—калгасу «Зорка».

КАЛГАС «НОВЫ СЬВЕТ»

Камуне «Іскра ленінская» перадае 27 цэнтн. вікі, калгасу «Зорка»—6 цэнтн. вікі, выменьвае ў калгасе імя Паркамуны 14 цэнтн. гароху.

Пачалі складаць вытворчыя пляны.

ДОЎЖА. (Па тэлефоне).

19 га сакавіка па сельсавеце пачалася работа па складаньні вытворчых плянаў. 18 га сакавіка была праведзена інструкцыйная нарада старшынь калгасаў, брыгадзіраў калгасных брыгад і брыгадзіраў з гораду, на якой даны канкрэтныя ўказаньні, як патрэбна складаць пляны. Усе брыгады разьехаліся па калгасах.

С.

Усебеларускі радыё-мітынг рабселькораў.

25-ГА САКАВІКА, А 6-Й ГАДЗ. УВЕЧАРЫ, У ПАМЯШКАНЬНІ ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ АДБУДЗЕЦЦА КАЛЕКТЫЎНЫЕ СЛУХАНЬНЕ РАДЫЁ-МІТЫНГУ РАБСЕЛЬКОРАЎ І РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖАК І ПАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТ.

РАБКОРЫ І РЭДАКТАРЫ НАСЬЦЕНГА ЗЭТ «ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА» НАКІРОЎВАЮЦЦА НА КАЛЕКТЫЎНАЕ СЛУХАНЬНЕ НА РАДЫЁ ВУЗЕЛ · СУМЕСНА З РЭДАКЦЫЯЙ ШМАТТЫРАЖКІ «МЭТПРОМАВЕЦ».

ЯЎКА АБАВЯЗКОВАЯ.

[illegible]ОП ГК КП(б)Б.

ПАСТАНОВА СЭКРАТАРЫЯТУ ГАРКОМУ КП(б)Б ад 23-га САКАВІКА 1933 г.

Аб артыкуле „Зьвязды“—„Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму“.

1. ГАРКОМ КП(б)Б АДЗНАЧАЕ, ШТО „ЗЬВЯЗДА“ ПРАВІЛЬНА ВЫКРЫВАЕ РАД ДАДАТКОВЫХ ФАКТАЎ ГРУБЕЙШЫХ СКАЖЭНЬНЯЎ У АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ І ТЫМ САМЫМ ДАПАМАГАЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ Ў ВЫПРАЎЛЕНЬНІ ДАПУШЧАНЫХ ПАМЫЛАК.

2. ДАРУЧЫЦЬ КАМІСІІ ГК ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ НАЦПЫТАНЬНЯ ДА ПЛЕНУМУ ГК РАСЬСЛЕДВАЦЬ ФАКТЫ, АДЗНАЧАНЫЯ Ў АРТЫКУЛЕ „ЗЬВЯЗДЫ“ І ПРАДСТАВІЦЬ СВАЕ ПРАПАНОВЫ НА БЮРО ГК КП(б)Б.

ПІСЬМЕНЬНІЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ ПАВІННА ВЫЙСЬЦІ З ГЛЫБОКАГА ПРАРЫВУ.

Улічыць урокі клясава-варожых вылазак на літаратурным фронце і гніла-лібэральных адносін да іх На аснове прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму узмацніць і актывізаваць барацьбу за сацыялістычную па зьмесьце, нацыянальную па форме літаратуру.

Кіруючы разгорнутым

будаўніцтвам сацыялістычнай культуры ў яе нацыянальнай форме, камуністычная партыя і савецкая ўлада ставяць ва главу кута „палітыку зближэньня пралетараў і поўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы“ (з праграмы УсеКП(б).

І мы бачым, як у Савецкай Беларусі, у краіне, якая раней была калёніяй расійскага імпэрыялізму, якая для пануючых клясаў існавала як аб'ект барбарскай эксплёатацыі, зараз, ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту, дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, адбываецца вялізарны культурны рост, у прыватнасьці нябачаны творчы росквіт мастацтва і літаратуры. Вялікі культурны рост Савецкага саюзу асабліва рэзка вылучаецца на фоне агульнага крызісу, заняпаду капіталістычнай гаспадаркі і культуры. Буржуазнае мастацтва і культура апынуліся ў бязвыходным тупіку і ўсё лепшае, прагрэсіўнае ў заходняэўрапейскай і амэрыканскай літаратуры і мастацтве рашуча выступае супроць эксплёататараў, на абарону Савецкага саюзу—бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту.

Перад савецкімі пісьменьнікамі

пастаўлена задача даць творы, вартыя нашай велікай рэчаіснасьці. Толькі актыўна ўдзельнічаючы ў нашым сацыялістычным будаўніцтве, толькі ідучы разам з рабочай клясай, пад кіраўніцтвам яе камуністычнай партыі, пісьменьнік можа разьвівацца і расьці. Мы павінны бязьлітасна змагацца з усім варожым, што перашкаджае стварэньню велікай літаратуры. Наша літаратура зьяўляецца войстрай зброяй клясавай барацьбы ў змаганьні за пабудову бясклясавага грамадзтва, у якім ня будзе эксплёатацыі чалавека чалавекам.

Гістарычная пастанова ЦК партыі ад 23 красавіка 1932 году выклікала асабліва ўзмоцнены далейшы рост беларускай савецкай літаратуры, аб чым сьведчаць такія творы, як „Бацькаўшчына“ К. Чорнага, „Спалох на загонах“ Галавача (2 е пераапрацаванае выданьне), „Хлебная зіма“ Александровіча, „Мядзьведзічы“ Крапівы, апавяданьні М Лынькова і інш. Маецца значны творчы ідэйна-палітычны рост і асноўных пісьменьнікаў Віцебску. Калі для ранейшай творчасьці нашых пісьменьнікаў было характэрна мэханістычнае захапленьне машынай, яе фэцішызацыя, эмпірычная назіральнасьць і простая павярхоўнасьць, то зараз мы маем круты паварот у бок паказу героаў сацыялістычнага будаўніцтва, адыходу ад прымітыўных форм і цэхавай абмежаванасьці. Лепшай ілюстрацыяй гэтага зьяўляюцца нарысы Андрэя Ушакова «Настаўнік Бранзбург», «Міліцыянэр Няміра», вершы «Пачатак жыцьця», нарыс Шыракова „Новае жыцьцё“, верш Жальвьняка „Марка: Георг Гехорт“, новыя творы Рэлеса. У галіне масавай працы пісьменьніцкай арганізацыяй Віцебшчыны праведзены рад літаратурных вечароў у рабочых клюбах, у чырвонаармейскіх часьцях і непасрэдна на вытворчасьці. Арганізаваны літгурткі на буйнейшых прадпрыемствах і навучальных установах.

Але трэба са ўсёй сілай сказаць, што ўся гэта праца нас ні ў якім разе задаволіць ня можа. У гэтай працы ёсьць рад буйных палітычных прарываў, якія з усёй рашучасьцю трэба крытыкаваць, якія неадкладна трэба выправіць.

Гэтыя прарывы

ідуць па лініі зусім недастатковай барацьбы з праявамі клясава-варожай дзейнасьці на ідэалёгічным фронце. Аргкамітэт саюзу пісьменьнікаў Віцебшчыны ня ўлічыў таго, што клясавы вораг «перабудаваўся, вьмяніў сваю тактыку, перайшоў ад прамой атакі да работы ціхай сапай» (Сталін).

Клясавы вораг, шалёна супраціўляючыся пераможнаму будаўніцтву сацыялізму, накіроўвае сваю зброю супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі. У сваёй пастанове ад 28 студзеня 1933 г. ЦК КП(б)Б «кваліфікуе зьяўленьне артыкулаў і твораў (Сідарэнка-Пеначкіна, Нікановіча і С. Баранавых) у нашых часопісах, як клясава-варожую вылазку рэваншысцкіх нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, адбіваючых у гэтых сваіх выступленьнях шалёнае супраціўленьне разгромленага, але яшчэ канчаткова недабітага клясавага ворага, разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню на ўсім фронце, вядучых сваю антысавецкую работу, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам».

У нас у Віцебску

мы мелі контррэвалюцыйныя выступленьні Журомскага (студэнт кіно-тэхнікуму), Верамейчыка (студэнт вэткамбінату), Балабошкі (панчошная фабрыка «К. Цэткін»). Гэтае кулацкае ахвосьце, пераклікаючыся з Нікановічамі, Сідарэнкамі і Баранавых, для сваіх антысавецкіх спраў спрабавалі выкарыстаць літаратуру, маскуючы контррэвалюцыйную агітацыю «мастацкімі» лахманамі.

Калі Нікановіч у сваіх «Журавінах» апэлюе да варожых клясаў, паклёпніцкі паказваючы быццам-бы цяжкае становішча савецкай інтэлігенцыі—пралетарскіх пісьменьнікаў, то Верамейчык, наўмысьля змазваючы вялізарнейшыя дасягненьні ленінскай нацыянальнай палітыкі ў галіне падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў спэцыялістаў, перад якімі ўскрываюцца шырокія пэрспэктывы непасрэднага ўдзелу ў пабудове бясклясавага грамадзтва, узводзіць брудны паклёп на наша пралетарскае студэнцтва. Па Верамейчыку выходзіць, што нашы студэнты ня бачаць ніякіх пэрспэктыў, што сярод іх панує роспач і бязвыходнасьць. Як бачым, Нікановіч знайшоў сабе агента ў асобе Верамейчыка.

Другі «літаратар» кулацтва Журомскі ў адчыненай контррэвалюцыйнай форме ў нібы «паэме» «Эпоха» нахабна паклёпнічае на Чырвоную армію, на наша сацыялістычнае культурнае будаўніцтва, знаходзіць агульную мову з С. Баранавых у пытаньнях калектывізацыі вёскі, загаварыўшы поўным голасам супроць калектывізацыі і хлебазагатовак. Балабошка, расьпяваючы ўсё, што толькі мог знайсьці пахабнага і парнаграфічнага ў сваіх вершаваных плявузганьнях, упрашае выкрэсьліць слова кляса, забыцца на ўсякую клясавую барацьбу, імкнецца адвесьці ўдар ад кулакоў і шкоднікаў, шальмуючы наша сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Зараз Журомскі і Верамейчык з нашых навучальных устаноў выключаны, але іх прысьпешнікі на ідэалёгічным фронце імкнуцца працягваць антысавецкую работу. Варта паказаць на тое, што да дню Чырвонай арміі драмгурток вэткамбінату рыхтаваў нацдэмаўскую п'есу Аляхновіча „Каліс“. А між тым, партыйныя і камсамольскія арганізацыі на мясцох ня ўлічылі ўрокаў клясава-варожых выступленьняў, якія мелі там месца. У вэткамбінаце, асабліва ў кіно-тэхнікуме і панчошнай фабрыцы, навокал вылазак Журомскага, Верамейчыка і Балабошкі грамадзкая думка ня створана, маса не мабілізавана, пытаньне на палітычную вышыню яшчэ ня ўзьнята, праца літаратурных гурткоў эпартуністычна недаацэньваецца.

У перадавым артыкуле

ЦО „Правда“ ад 10|III 1933 г. з усёй бальшавіцкай яснасьцю сказана: «контррэвалюцыйная дзейнасьць усякага роду шавіністаў і ўхілістаў у нацыяльным пытаньні палягчаецца, а ў радзе выпадкаў аказваецца магчымай, перш за ўсё дзякуючы невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці, а часам і грубым памылкам мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый».

Што дало мажлівасьць актывізавацца клясаваму ворагу на літаратурным фронце ў Віцебску? Перш за ўсё прытупленьне клясавай пільнасьці з боку аргкамітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў Віцебшчыны, які не аргавізаваў растлумачэньне клясавай сутнасьці вылазак Нікановіча, Сідарэнкі і Баранавых, які несвоечасова мабілізаваў пісьменьнікаў і літгурткоўцаў на барацьбу супроць ворага, які прыкрываецца фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Члены саюзу Мазуркевіч і Васілёнак, выкладаючы літаратуру ў вэткамбінаце, не разгарнулі масавай працы па мабілізацыі студэнцтва супроць клясава-варожых вылазак на літаратурным фронце, па ўзьняцьці іх пралетарскай пільнасьці. Гэта дало мажлівасьць актывізавацца Верамейчыкам. Пісьменьнік Андрэй Ушакоў, выступаючы на сходах, у кінотэхнікуме, выгаражваў Журомскага, заяўляў аб наноснасьці яго настрояў і, замест рашучага адпору клясаваму ворагу, займаўся размовамі аб перавыхаваньні Журомскага.

Гаворачы аб палітычных памылках у працы пісьменьніцкай арганізацыі, трэба адзначыць і долю палітычнай віны аўтара гэтага артыкулу, які недастаткова рашуча рэагаваў на лібэральна-прымірэнчыя адносіны паасобных пісьменьнікаў да варожых вылазак. і нават сам гніла-лібэральна адносіўся да антысавецкіх выпадаў пісьменьніка Шолама Ізраіліта. ізраіліт, спэкуляючы нашымі цяжкасьцямі, у свой час насіўся з размовамі, што «пяцігодка нічога не дала», пастанову ЦК партыі ад 23 красавіка ў гутарках кваліфікаваў «як адступленьне перад цяжкасьцямі». Навакол гэтых фактаў грамадзкай думкі створана ня было, мае рэагаваньне абмежавалася некалькімі папярэджваньнямі Ізраіліта. Зусім ясна, што гэта палягчала дзейнасьць клясава-варожых элемэнтаў на літаратурным фронце.

Зараз нас

ні ў якім разе ня могуць задаволіць голыя дэклярацыі пісьменьнікаў. Замест гэтага мы патрабуем «па сапраўднаму ўзмацніць клясавую пільнасьць кожнага камуніста, камсамольца, актывіста-пісьменьніка, павысіць творчую актыўнасьць і барацьбу з клясавым ворагам самімі творамі паэтаў і пісьменьнікаў БССР, памятаючы, што вораг зараз прымае новую лічыну, зачастую маскуючы сваю антысавецкую дзейнасьць фальшыва-нацыянальным сьцягам» (з пастановы аргкамітэту ССПБ). Рэвалюцыйная пільнасьць зьяўляецца той самай якасьцю, якая асабліва неабходна зараз бальшавікам. Гэта паказаньне т. Сталіна набывае для нас выключнае значэньне.

У сваёй пастанове ад 8 сакавіка 1933 г. бюро гаркому і прэзыдыум гарКК „абавязваюць культпроп не пазьней як праз дэкаду ўнесьці прапановы аб умацаваньні кіраўніцтва літаратурна-мастацкімі арганізацыямі раёну“. Гэта пастанова выклікана неабходнасьцю забясьпечыць усе вучасткі культурна-нацыянальнага будаўніцтва моцнымі партыйнымі кадрамі, бо на гэтым фронце ў Віцебску асабліва небясьпечнае месца.

Пад кіраўніцтвам

гарадзкога камітэту партыі, вядучы бальшавіцкую барацьбу на два франты—з вялікадзяржаўным шавінізмам, як асноўнай небясьпекай на дадзеным этапе, з актывізуючыміся зараз недабітымі яшчэ рэшткамі контррэвалюцыйнай беларускай нацдэмаўшчыны і шавінізмамі іншых колераў, віцебская літаратурная арганізацыя выйдзе з тых глыбокіх палітычных прарываў, у якіх яна зараз знаходзіцца.

Бр. Лугоўскі.

З пошты „Віцебскага пралетара“.

Больш пільнасьці, бязьлітасна выкрываць і караць клясавага ворага.

АЧЫСЬЦІЦЬ ТРАНСПАРТ АД ВОРАГАЎ НАРОДУ.

У вагонную майстэрню клясаваму ворагу адчынены вароты.

(Ліст чыгуначніка).

У вагоннай майстэрні працуе сталяром Дрылёнак Лявон. Жыў ён раней у вёсцы Саланец, Лёзьненскага раёну. Яго сацыяльны твар характарызаваць можна некалькімі словамі: жандар, потым царкоўны стараста.

За контррэвалюцыйную дзейнасьць (агітацыю супроць савецкай улады, зрыў дэманстрацыі 1-га мая) ён быў выслан у воддальныя краі тэрмінам на тры гады.

Дрылёнак меў чатыры хутары зямлі, з якіх два адышлі ў калгас, а два з плошчай у 8 га засталіся яму. Гэта зямля была ім захавана ад падатку. Дзякуючы таму, што ў складзе сельсавету быў яго брат Дрылёнак Нікіпар, кулак і контррэвалюцыянэр Дрылёнак Лявон зрабіў падложныя дакуманты, выпісаўся са складу сям'і і прымазаўся на працу на ст. Віцебск у вагонную майстэрню.

Сын Дрылёнка Андрэй працуе зараз на фабрыцы «Дзьвіна». Ён таксама мае за сабою цёмнае мінулае. Яшчэ будучы вучнем у Лёзьненскай сямігодцы, ён абакраў яе, за што быў выключан са школы.

Рабкор.

АД РЭДАКЦЫІ. Якім чынам Дрылёнак Лявон папаў на працу ў вогонную майстэрню,—невядома. У асабовым стале мэйстэрні няма на яго ні працоўнага сьпісу, ні асабовай карткі, не фігуруе яго прозьвішча ні ў адным загадзе. Мы зварачваем увагу начальніка вагоннай майстэрні тав. Красікава, што пры існуючай сыстэме і парадку прыёму і рэгістрацыі ўноў прыбываючых рабочых, клясавы вораг можа лёгка пралязьць. Мы патрабуем умяшацельства пракуратуры ў гэтую справу.

Чаму вораг народу Ўронскі працягвае працаваць на транспарце?

(Ліст чыгуначніка).

Доўгі час на таварным двары грузчыкам працаваў Уронскі. Яго сацыяльны твар арганізацыі таварнага двара ня ведалі. І толькі пасьля таго, як ён быў выкрыты ў хітчэньні мукі, яго зволілі Да адказнасьці Ўронскі прыцягнуты ня быў. Ён і зараз працуе на чыгунцы, толькі перамяніў месца службы: з таварнага двара перайшоў на вугальны склад.

Уронскі—цьвёрдазаданьнік. Пранікшы на транспарт, ён займаўся хітчэньнем, вёў падрыўную работу па разлажэньні працоўнай дысцыпліны, адначасова сам паказваючы «добрыя» прыклады работы, за што і атрымаў нават ударную картку.

Мы патрабуем звальненьня з транспарту Ўронскага і прыцягненьня яго да адказнасьці, а таксама і тых, хто яго прыняў на вугальны склад.

Рабочы.

НЕ ПАКІНУЦЬ НІВОДНАГА БЕРВЯНА НА БЕРАЗЕ.

● Узровень вады а 7 гадзіне раніцы 23 сакавіка складаў 574 см. а 13 гадзіне дню—570 см. звыш ардынару. Выпадкаў заліву ўзьбярэжных кварталаў гораду ня было. Ледаход 22 сакавіка ўвечары пачаўся ад жалезнага мосту і адышоў на 4 клм. Учора раніцою ледаход зноў пачаўся і адышоў да Старога Сяла.

● 5000 кубамэтраў будматар'ялаў фабрыкі імя КІМ і лесзаводу імя „Правды“ зьнясло на 9 клм. у час ледаходу. Пяцёрка па барацьбе з паводкай мабілізавала насельніцтва Пралетарскай слабады і рабочых фабрыкі імя КІМ і лесзаводу імя „Правды“ на ратаваньне будматар'ялаў. Адначасова адгукнуліся чырвонаармейскія часткі, якія выслалі 200 чал. на дапамогу. Усяго мабілізавана каля 1000 чал. Адратавана пакуль 300 кубамэтраў будматар'ялаў.

● Тав. Зотаў—загадчык Захадалесу ўчора перадаў аб тым, што 22 сакавіка ўбраны з берагу ўвесь лесабудматар'ял на тэрыторыі Чэпі на і вёскі Балткі (Княжыца).

● Узровень вады да 7 гадзін увечары ўчора складаў 565 см. Тэм[illegible]тура паветры—1°.

КАЛДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ 1933 г.

ДА 1-га КРАСАВІКА НА ЎСІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАКЛЮЧАНЫ НОВЫЯ КАЛДАГАВОРЫ.

Калдагаворная кампанія гэтага году павінна зьявіцца вялікай мабілізуючай сілай рабочых мас на пасьпяховае ажыцьцяўленьне плянаў 1933 г.—першага году другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Калдагавор, у аснову якога павінны быць пакладзены рашэньні гістарычнага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), павінен садзейнічаць далейшаму ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы, палепшаньню якасьці прадукцыі, зьніжэньню сабекошту і асваеньню новай тэхнікі і новых прадпрыемстваў. Пункты новага калдагавору павінны быць напоўнены дзесяткамі, сотнямі канкрэтных рабочых прапаноў для паляпшэньня работы вытворчасьці і паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў.

Асаблівая ўвага павінна быць удзелена правільнаму выдаткаваньню фондаў зарплаты і ліквідацыі ўраўнілаўкі, якая затрымлівае рост прадукцыйнасьці працы.

Па віцебскіх прадпрыемствах мы маем вялічэзнейшае перавыдаткаваньне фондаў зарплаты за мінулы год. Так, фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі“ перавыдаткавала за 1932 г. 600.000 р. Гэта рэзультат таго, што на фабрыцы яшчэ ня зьнішчана ўраўнілаўка, не перабудавана тэхнічнае нармаваньне. Задача новых калдагавароў, папярэдзіць перавыдаткаваньне фондаў зарплаты на аснове складаньня тэхнічна-абгрунтаваных норм і расцэнак і рашучага ўздыму прадукцыйнасьці працы. «Асновай калдагавароў павінна стаць далейшая барацьба з рэшткамі ўраўнілаўкі шляхам выдзяленьня ў аплаце вядучых прафэсій, а таксама рабочых на гарачых, цяжкіх і шкодных работах і ўсямернага заахвочваньня пераходу на вядзельшчыну» (з пастановы УсеЦСПС і Наркаматаў прамысловасьці).

У час калдагаворнай кампаніі па прадпрыемствах павінен праводзіцца перагляд заніжаных і ўстарэлых норм. Існаваўшыя дагэтуль нормы альбо зараз заніжаны, альбо ўстарэлі. На абутковай фабрыцы імя Лекерта патрэбна пераглядзець 107 заніжаных норм. Падлічана, што ўстанаўленьне новых тэхнічных норм павінна даць 40.300 руб. эканоміі. І гэта ня толькі на абутковай фабрыцы. Калі сапраўды глыбока заняцца пераглядам заніжаных норм, то мы амаль на ўсіх прадпрыемствах апынемся перад такім фактам. Задача гаспадарнікаў і прафсаюзных арганізацый да 1-га красавіка, згодна пастановы УсеЦСПС і Наркаматаў прамысловасьці закончыць перагляд заніжаных і ўстарэлых норм. Глыбока памыляецца той, хто думае, што гэты перагляд можна правесьці мэханічна, адарвана ад рабочых мас. Перагляд павінен праводзіцца масава, з удзелам шырокіх рабочых мас і ІТР.

Па-новаму ставіцца ў калдагаворах гэтага году пытаньне барацьбы за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны. Прагульшчыку, лодыру, рвачу, лятуну—зрыўшчыкам выкананьня нашых плянаў ніякай літасьці, ніякага лібэральнічаньня.

Па ўсіх гэтых пытаньнях у калектыўных дагаворах павінны быць прадугледжаны канкрэтныя мерапрыемствы. Ніякіх агульных слоў у калдагаворах, ніякіх абавязацельстваў «наогул». Кожны пункт калектыўнага дагавору павінен заключаць дасканалы каляндарны плян выкананьня абавязацельстваў, з паказаньнем асоб, адказных за правядзеньне тых ці іншых мерапрыемстваў.

Да 1 га красавіка 1933 году на ўсіх нашых прадпрыемствах павінны быць заключаны новыя калдагаворы. Застаўшыяся 8 дзён павінны быць пратвораны ў дні ўдарнага завяршэньня работы сэмаправерачных брыгад і падагульненьня вынікаў праверкі выкананьня ўмоў старага калдагавору і складаньня новага.

Авэрбух.

Ніводзін пашпарт не павінен папасьці ў рукі клясава-варожых антысавецкіх элемэнтаў.

Высокая клясавая пільнасьць, як ніколі, павінна быць праяўлена ў часе кампаніі па выдачы пашпартоў.

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ КАМПАНІІ ПА ПАШПАРТЫЗАЦЫІ.

Пастанова гаркому КП(б)Б ад 20 сакавіка.

Надаючы вялікае палітычнае значэньне ўвядзеньню адзінай пашпартай сыстэмы, ГК абавязвае парткалектывы, фракцыі ФЗМК, камсамольскія арганізацыі ўвядзеньне адзінай пашпартнай сыстэмы правесьці як баявую палітычную кампанію.

1. Абавязаць тав. Элксэ зрабіць інфармацыйны даклад аб задачах увядзеньня адзінай пашпартнай сыстэмы на сходзе партыйнага і прафактыву 21 сакавіка г. г.

2. 24 сакавіка правесьці заняткі ўсіх агіткалектываў з удзелам актыву прадпрыемстваў па пытаньні аб парадку выдачы пашпартаў і задачах палітагітацыі ў сувязі з гэтай кампаніяй.

3. Правесьці 28 сакавіка г. г. адзіны палітмасавы дзень рабочых і служачых па ўсіх прадпрыемствах і ўстановах па пытаньні пашпартнай сыстэмы. Прапанаваць агітмасаддзелу забясьпечыць дакладчыкамі ўсе прадпрыемствы, правёўшы інструктаж іх 24 сакавіка.

4. Склікаць 31 сакавіка г. г. па ўсіх жактах сходы па пытаньні «Пашпартная сыстэма і задачы жактаў».

5. Арганізаваць не пазьней 29 сакавіка г.г. па ўсіх прадпрыемствах, установах і жактах камісіі садзейнічаньня пашпартным пунктам з ліку камуністаў, камсамольцаў і лепшых рабочых-ударнікаў. Камісіі складаюцца з трыкутнікаў прадпрыемстваў, 12 актывістаў—лепшых ўдарнікаў, непасрэдна рабочых зад варштату.

6. Правесьці 2 красавіка зьлёт членаў камісій садзейнічаньня прадпрыемстваў, устаноў і жактаў для інструктаваньня аб іх ролі ў правядзеньні пашпартнай сыстэмы. Правядзеньне гэтага мерапрыемства ўскласьці на т. Элксэ.

7. Абавязаць газэту «Віцебскі пралетары» надрукаваць матар'ял для агітатараў аб задачах палітагітацыі ў сувязі з правядзеньнем кампаніі па пашпартызацыі, штодзённа асьвятляючы ход гэтай кампаніі па прадпрыемствах.

8. Абавязаць аддзел палітасьветы прыступіць да абсталяваньня пашпартных пунктаў адпаведнымі лёзунгамі, плякатамі, дыяграмамі, шашкамі, шахматамі.

9. Прапанаваць Дому камасьветы падабраць адпаведную літаратуру па пытаньні пашпартызацыі. Там-жа арганізаваць кансультацыю для дакладчыкаў.

10. Гарком КП(б)Б заклікае ўсю партыйную і камсамольскую арганізацыю да праяўленьня бальшавіцкай пільнасьці і клясавага пачуцьця, абапіраючыся на шырокія масы рабочых, з пралетарскай цьвёрдасьцю ачысьціцца ад клясава-варожых элемэнтаў, што пранікілі на нашыя прадпрыемствы і ўстановы. Трэба памятаць, што ўвядзеньне пашпартнай сыстэмы нямінуча сустрэне супраціўленьне клясава варожых элемэнтаў, трэба памятаць, што паразытычныя элемэнты будуць скарыстоўваць наймалейшую магчымасьць замаскавацца, укрыцца, захавацца іменна ў горадзе, на новабудоўлях. Задачай партарганізацыі і зьяўляецца—даць адпор, прагнаць вароў, тунеядцаў, жулікаў, хуліганаў, прыхлябальнікаў.

Такая на бліжэйшыя месяцы адна з асноўных задач.

Сэкратар гаркому КП(б)Б МІЦЬКОЎ.

28-га САКАВІКА—АДЗІНЫ ПАЛІТМАСАВЫ ДЗЕНЬ ПА ПЫТАНЬНІ ЎВЯДЗЕНЬНЯ ПАШПАРТНАЙ СЫСТЭМЫ.

Згодна рашэньня гаркому КП(б)Б, прапануецца ўсім парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б арганізаць 28-га сакавіка адзіны палітмасавы дзень рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў гораду на тэму: „Задачы ўвядзеньня адзінай пашпартнай сыстэмы“.

Для дапамогі ў правядзеньні палітдня вылучаны наступныя таварышы:

Фабрыка імя Лекерта—Росін (міліцыя).
Акулярная фабрыка—Кунцэвіч (міліцыя)
Фабрыка «Дзьвіна»—Пісьманік (навукова-дасьледчы інстытут).
Завод «Чырвоны мэталіст»—Бжозэ (вэтінстытут).
Фабрыка «Прафінтэрн»—Літвінаў (міліцыя).
Скурзавод—Эпштэйн (пэдінстытут).
Шпоткамбінат—Прусьлін (СПШ).
Фабрыка «КІМ»—Вігдэргаўз (ЦП тэкстыльшчыкаў).
Лесзавод імя „Правды“—Шэйнман (міліцыя)
Фабрыка імя Цэткін—Ражанскі.
Цяга МБВ—Мацьвеенка (МБВ).
Эксплёат. МБВ—Фактаровіч (МБВ).
Вагон. гаспадар.—Пагарэльская (вэтінстытут).
Фабрыка „Сьцяг інд.“—Элксэ (кіраўн. міліцыі).
База Белутыля—Сакалова (пракуратура).
Белбудаб'ядн.—Жэлезьняк (вэтінстытут).
Завод «Камінтэрн»—Дабравольскі (саюз працасьветы).
Белбудканторa—Сьвярдлоў (міліцыя).
«Прагрэс»—Бабіцкі (гарашчадкаса).
Піўзавод—Дуброў (Дом камасьветы).
Хлебазавод—Пэскін (РСІ).
Дрожджазавод—Багдановіч (міліцыя).
Сьпіртзавод—Дзямідаў (камвуз).
Інвал. каапэрацыя—Сарвайскі (прапагандыст).
Махорачная фабрыка—Гіцовіч (ЦРК).
К-т узаемадапамогі—Казавноўскі (Паліклініка).
Інстр.-мэбл. фабрыка—Ваўчок (Камунбанк).
Фабрыка гнутай мэблі—Болдышаў (СПШ).
Аўтабаза—Пустэрман (банк).
Голкавая фабрыка—Скараходкін (міліцыя).
Маслазавод—Адэгаў (шэфтаварыства).
Дэпо трамвая—Фрэйдзінзон (камгас).
Грам харч—Адам (гарФА).
Водны транспарт—Нэйман (парторг).
Саюзтранс—Іваноў (міліцыя).
Асьвегнікі—Роззэнблюм (рэдакцыя).
Прамарцель шэйна-трыкатажн. аб'ядн.—Сяліванаў (Белутыль).
Прэмарцель скурана-абутков. аб'ядн.—Прудніковў (СПШ).
Друкарня—Шчуцкі (музэй).
Групком будаўнікоў № 22—Кузьняцоў (міліцыя).
Плодвінзавод—Бляхман (7 я сямігодка).
Майст. ОДД—Урвіцкі (рабфак сувязі).
Мясакамбінат—Міцкевіч (міліцыя)
Скабяная фабрыка—Файнбэрг (скабяная фабрыка).
Лямецкая фабрыка—Зьвягін (страхкаса).
Люстэркавая фабрыка—Сямёнаў (люстэркавая).

Астатнія ячэйкі праводзяць палітмасавы дзень сваімі сіламі.

* * *

Сёньня, а 2-й гадз. дню, у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б адбудзецца інструкцыйная нарада дакладчыкаў. Яўка АБАВЯЗКОВА.

Вылучаныя дакладчыкі павінны зьявіцца на вызначаныя прадпрыемствы для дапамогі ячэйкам і калектывам у падрыхтоўцы да палітмасавага дню не пазьней 26-га сакавіка.

Прапануецца сэкратарам парткалектываў, ячэек і групагітатарам арганізаваць папярэдні збор запытаньняў рабочых і служачых на паказаную тэму. Вынікі палітмасавага дню і запытаньні рабочых і служачых прадставіць у гарком КП(б)Б, пакой № 1 не пазьней 30-га сакавіка Гарком забараняе заняць гэты дзень іншымі мерапрыемствамі.

АГІТМАСАДДЗЕЛ ГАРКОМУ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Віцгарліт № 12. Друкарня „Камінтэрн“ [illegible]вецкая, 10. Тыраж 8.500 экз.